Газета дзяржаўнай установы адукацыі
“Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа”



# Перапынак!



№9
Май, 2021

Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

## Чытайце ў нумары:

«Быць годнымі Вялікай Перамогі» стр. 2

Міжнародны дзень сям'і стар. 3

Працоўная вясна стар. 4

Апошні званок стар.5

Тыдзень турызму і краязнаўства стар. 6

# «Быць годнымі Вялікай Перамогі»

Кожны год наш народ кланяецца вялікай даце, хоць прайшло ўжо 76 гадоў. Час не можа аддаць іх забыццю. Ёсць памяць, якой не будзе канца.

У рамках грамадзянска-патрыятычнай акцыі, прысвечанай 76-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне «Быць годнымі Вялікай Перамогі», у нашай установе прайшоў святочны канцэрт “Кветкі Перамогі”.

Да падрастаючага пакалення са словамі смутку, памяці і павагі звярнуліся дырэктар нашай установы Казлова Марыя Міхайлаўна і старшыня фаніпальскага сельскага выканкама Лабач Уладзімір Іосіфавіч. “Мы ганарымся ветэранамі краіны і нашага агроагарадка, працаўнікамі тылу, якія не шкадуючы сябе набліжалі Перамогу. Памяць аб вайне і пакаленні пераможцаў будзе жыць вечна. Баявы шлях кожнага ўдзельніка вайны – сапраўдны подзвіг дзеля жыцця на Зямлі”.




Пасля канцэртнай праграмы адбылася цэрымонія ўскладання кветак, як даніна памяці усім салдатам Вялікай Айчыннай вайны.









# Міжнародны дзень сям'і

Штогод 15 мая адзначаецца Міжнародны дзень сям'і. Сям'я - крыніца любові, павагі, салідарнасці і прыхільнасці. Дзякуючы сям'і мацнее і развіваецца дзяржава, расце дабрабыт народа. З сям'і пачынаецца жыццё чалавека, тут адбываецца фарміраванне яго як грамадзяніна. Сям'я - гэта дом, гэта месца, дзе утульна і спакойна, дзе заўсёды зразумеюць і падтрымаюць, дапамогуць вырашыць праблемы і шчыра падзеляць радасць. Вельмі важна, каб сям'я была трывалай і поўнай. Сям'я - гэта найважнейшае асяроддзе для захавання і перадачы з пакалення ў пакаленне культурных каштоўнасцей, нацыянальных традыцый, яна маральна і матэрыяльна падтрымлівае дзяцей, старых і інвалідаў.

Шмат мерапрыемстваў было прысвечана гэтаму дню: класныя гадзіны, гутаркі кніжныя выставы і інш. Асабліва цікавай і запамінальнай была сустрэча з мнагадзетнай мамай - Пасканюк Алесяй Віктараўнай. У іх сям'і выхоўваецца пяцёра дзяцей. У гэтым годзе Алесі Віктараўне быў уручаны Ордэн Маці.










# Працоўная вясна

У вясновыя дні на тэрыторыі ўстановы адукацыі можна ўбачыць вясёлыя гурты хлопчыкаў і дзяўчынак, якія пад наглядам дарослых старанна наводзяць чысціню і ствараюць прыгожыя клумбы. Для дзяцей такая праца на свежым паветры не менш карысная і захапляльная, чым пазнанне ў школьных сценах таямніц навук. У рамках традыцыйных акцыі "Чысты двор", "Чыстая вёска", "Кветнік" прышкольная тэрыторыя набывае ўрачысты выгляд. Пабелены бардзюры, праполаты клумбы, пасаджаны кветкі. Праца калектыву і навучэнцаў установы па добраўпарадкаванні прышкольнай тэрыторыі — гэта малая частка той вялікай і маштабнай работы, што праводзіцца ва ўстановах адукацыі па наданні нашай зямлі чысціні і ўтульнасці. Працоўная вясна ідзе. Сустрэнем яе годна!











# Апошні званок

Здавалася б, такі чаканы дзень,
Але чамусьці незвычайна сумны.
Сышоў на травы ледзь улоўны цень
І ў зморшчынках на лобе – столькі думак.
Успомняцца ў адно імгненне тут:
і першы клас, і першае каханне,
і двойка першая – для кожнага прысуд,
якому роўнага не знойдзеш пакарання.
Надзіва, усе настаўнікі, бацькі
Убачацца ў мілейшым самым свеце.

Захочацца вярнуць усе званкі
На гэтай самай дарагой планеце.











# Тыдзень турызму і краязнаўства

У канцы мая ў нашай установе адукацыі прайшоў тыдзень турызму і краязнаўства. Для навучэнцаў былі арганізаваны экскурсія ў гісторыка-культурны комплекс “Лінія Сталіна”, велапаход у в. Воўкавічы да абеліска салдатам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчынай вайны, турысцкі міні-практыкум, інфармацыйныя гадзіны “Падарожжа па роднаму краю” і інш.

Удзельнікі турысцка-спартыўных мерапрыемстваў атрымалі зарад бадзёрасці, шмат незабыўных ураджанняў і прыемнага карыснага адпачынку.









